I 547421

Мікола Ільяшэвіч
Доктар філёзофіі

# КАРОТКІ НАРЫС ПСЫХОЛЁГІІ

ВІЛЬНЯ 1932.

Wileńskie Starostwo Grodzkie
Egzemplarz obowiązkowy
Nakład I Egzempl. 1000
Dnia 30/X 1931 r.

Мікола Ільяшэвіч
Доктар філёзофіі

# Кароткі нарыс псыхолёгіі

З дадаткам беларуска - расейска-польскага слоўніка псыхолёгічных тэрмінаў і пяцьцю ільлюстрацыямі ў тэксьце.

Вільня, 1932.

BIBLIOTEKA NARODOWA

I. 547.421

*Dr. Mik. Iljaszewicz* — „Krótki zarys psychologji".
Выданьне аўтара. Друкавана ў Беларускай
Друкарні ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная 6.

# ПРАДМОВА.

Час і беларуская школа вымагаюць падручніка псыхолёгіі. Нажаль, аднак, на беларускім кніжным рынку дагэтуль ніякае літэратуры ў гэтай галіне няма. Вось-жа, каб даць хоць галоўныя падставы псыхолёгіі, выдаецца гэты „Кароткі нарыс псыхолёгіі.“ З конспэктыўнасьці кніжкі вынікае, натуральна, шмат недасканальнасьцяў як падручніка. Сьпешнасьць і абставіны выдавецкага характару змусілі абмежавацца аўтара толькі да галоўных мамэнтаў і дэфініцыяў паасобных аддзелаў прадмету. Аднак, пры паглыбленьні пададзенага матэр'ялу праз вучыцеля ў школе, або адпаведную літэратуру, прыдасцца й гэты конспэкт. Пры ўкладаньні яго ўзяты пад увагу сярэдняшкольныя падручнікі польскія, расейскія і чэскія (Г. Челпанов, E. B. Titchener, Fr. Krejči, W. Witwicki і іншыя.) Найвялікшай перашкодай пры ўкладаньні гэтае кніжкі была часта поўная адсутнасьць і недасканальнасьць тэрмінолёгіі з лёгікі й псыхолёгіі ў беларускай мове. Аўтар спадзяецца, што праз выданьне адпаведнага падручніка ўсе недахопы гэтага „Кароткага нарысу“ будуць у будучыне выпраўлены.

Адначасна ў канцы кніжкі далучаецца кароткі тэрміналягічны беларуска-расейска-польскі слоўнічак, які будзе палёгкай для беларускай школьнай моладзі пры карыстаньні, найбольш даступнай ёй, польскай і расейскай псыхолёгічнай літэратурай. Слоўнічак гэты часткова паўстаў з „Тэрмінолёгіі па лёгіцы і псыхолёгіі“ выданьня Інстытуту Беларускай Культуры з некаторымі асабістымі зьменамі і дапаўненьнямі.

З прычыны таго, што кніжка гэтая зложылася з паасобных зацемак, падчас выкладаньня аўтарам псыхолёгіі вучням VIII клясы Віленскае Беларускае гімназіі, мова яе ня зусім популярная.

АЎТАР.

Вільня, у кастрычніку 1931 г.

## УСТУП.

**Прадмет псыхолёгіі.** Псыхолёгія — слова грэцкае; у перакладзе на нашу мову азначае яно навуку аб душы (псюхэ — душа і логос—навука). Ёсьць дзьве псыхолёгіі, якія розьняцца між сабой мэтадамі й прадметам разважаньняў: адна — мэтафізычная й другая — эмпірычная. Мэтафізычная псыхолёгія разглядае такія справы, як: што такое душа, што такое сапраўднасьць і г. д., наагул, справы, якія не падлягаюць досьледу. Эмпірычная псыхолёгія, якой будзем займацца, разглядае ўсялякія псыхічныя зьявішчы, якія падлягаюць нашаму досьледу. Адсюль назова псыхолёгіі экспэрымэнальнай. Іншыя азначаюць псыхолёгію, як навуку аб законах нашых псыхічных зьявішчаў.

**Псыхічныя й фізычныя зьявішчы.** Псыхічныя зьявішчы адбываюцца ў нас і дзеля гэтага называюцца ўнутранымі (мне сумна, я нешта прыпомніў, я гневаюся і г. д.) Фізычныя зьявішчы адбываюцца звонку нас і называюцца вонкавымі (вада цячэ, зямля кружыцца вакол сонца і г. д.) або матэр'яльнымі. Псыхічныя зьявішчы могуць спасьцерагаць толькі жывыя істоты, у той час як фізычныя зьявішчы могуць адбывацца і паміма нашага спасьцераганьня. Псыхічныя зьявішчы адбываюцца толькі ўва мне і толькі я магу іх спасьцерагаць. Фізычныя зьявішчы могуць быць даступны спасьцярозе шмат каго. Зьявішчы псыхічныя і матэр'альныя, як вынікае з вышэй сказанага, зусім розныя. Што ёсьць душэўным ня можа быць матэр'яльным, а што ёсьць матэр'яльным —

ня можа быць душэўным. Але мы ведаем, што і жыцьцё душэўнае само па сабе не істнавала-б, каб не закладалася на матэр'яльным (у данным прыпадку цялесным) падкладзе. Нідзе не знаходзім індывідуума адушаўлёнага*) бяз цела, але затое знаем індывідуумы цялесныя адушаўлёныя. Значыцца, гдзе ёсьць жыцьцё псыхічнае, там абавязкава павінен быць падклад матэр'яльны, але там гдзе ёсьць матэрыя, не абавязкава мусяць быць яшчэ зьявішчы псыхічныя.

З досьледу мы заключаем, што кожнаму стану нашае сьведамасьці (псыхічнай дзейнасьці) абавязкава адпавядае пэўнае дзеяньне, ці лепш кажучы, раздражненьне ў нашым целе. Напрыклад: каб пачуць нешта, трэба ворган вуха, каб мысьліць, трэба мозг. і г. д. Узноў-жа, аналізуючы асяродзішча, у якім чалавек жыве, мы знойдзем, што істнуюць два рады раздражненьняў: з н а д в о р н ы я і ў н у т р а н ы. Паміж матэр'яльнымі і душэўнымі зьявішчамі ў нармальнага чалавека істнуе пэўная г а р м о н і я, пэўная раўналежнасьць прабегу працэсаў.*)

Усялякія зьмены ў нашым целе завуцца р э а к ц ы я м і г. ё., што жывы арганізм адказвае на раздражненьні наўкольнага асяродзішча. Раздражненьні дзеюць на нэрвовую, вельмі чулую, сыстэму (мамэнт фізіолёгічны) і зьяўляюцца ў значнай меры прычынай псыхічных зьявішчаў. Можна часам заўважаць пэўныя фізіолёгічныя зьмены ў арганізьме. Напр., калі чалавек чырванее, дык прычынай ёсьць нейкае „пачуцьцё сораму“—прычына ўнутраная; або, напрыклад, сьцюжа выклікае пэўнае зьёжаньне цела й выяўляе мамэнт няпры-

---

*) тэрмін душа шматзначны; ужываем тут яго ў разуменьні псыхічнага жыцьця.

*) Раўналежнасьць матэр'яльных і псыхічных зьяв'шчаў у філёзофіі называецца псыхофізычным параллелізмам.

емнасьці,—прычына вонкавая. Можна з пэўнасьцю сказаць, што паміж душой і целам істнуе ўзаемадзейнасьць. Ужо вельмі даўно склалася нават пагаворка: „у здаровым целе—здаровы дух!“. Значыцца, калі прычына вонкавая—вынікі ўнутраныя, і наадварот. Але ня ўсе часьці цела ў аднолькавым адношаньні да арганізму, напр. пазуры й валасы астрыгаем, але не адчуваем болю.

**Заданьне псыхолёгіі.** Псыхолёгія займаецца аналізаваньнем псыхічных зьявішчаў, дасьледжваньнем, расклясыфікаваньнем іх і адшуканьнем між імі прычыннае сувязі (тлумачэньнем зьявішчаў). Адсюль у псыхолёгіі ёсьць шмат кірункаў. Так, напр., разрозьніваем апісальную псыхолёгію, псыхоаналізу, псыхофізыолёгію і т. д. Псыхолёгія, як і кожная навука, адкрывае законы на падставе аналізы фактаў, а іменна, законы, якімі кіруецца нашая псыхічная дзеяльнасьць. Займаючыся псыхолёгіяй, мы бліжэй падходзім да свайго духовага жыцьця ў разуменьні, пастаўленым ящчэ Сакратам — „пазнай самога сябе!“. Псыхолёгія падгатаўляе нас да філёзофічнага думаньня, а таму побач з лёгікай (навукай аб правідловым мысьленьні) становіць г. зв. *філёзофічную пропэдэўтыку.*)

**Мэтад псыхолёгіі.** Мэтад псыхолёгіі — эмпірычны. Мэты свае хоча дапяць псыхолёгія перадусім двума спосабамі: 1) раскладаньнем зьявішчаў душэўных на больш простыя і 2) на падставе простых разложаных, чыньнікаў тлумачэньнем складанага душэўнага жыцьця. Першы від паступаваньня завецца аналітычна-індуктыўным, другі — сынтэтычна-дэдуктыўным. Дзеецца гэта пры помачы спасьцеражэньня, або обсэрвацыі, як сябе, гэтак і іншых асоб.

*) Філёзофія навука аб суцэльным паглядзе на жыцьцё і сьвет.

Самаспасьцярога ў псыхолёгіі завецца яшчэ інтроспэкцыяй. Самаспасьцеражэньні ўзноў-жа бываюць падвойныя: суб'ектыўныя і об'ектыўныя. Суб'ектыўныя даступны толькі тым, хто іх сам перажывае, яны адначасна зьяўляюцца для гэтае асобы пераконваючымі. Об'ектыўнае-ж спасьцеражэньне заключаецца ў тым, што мы вынікі псыхічнага жыцьця іншых інвывідуумаў пераносім на нашае ўласнае „я". Напрыклад, бачучы сьмяючыйся выраз твару і чуючы сьмех, мы робім вывад, што пэўная асоба выяўляе пачуцьцё радасьці, бо падобныя праявы былі і ў нас самых, калі мы перажывалі падобны мамэнт радасьці.

Апрача інтроспэктыўнага мэтаду гуляе вялікую ролю мэтад справаздачы іншых асобаў, досьледы жыцьця людзей на розных ступенях разьвіцьця, экспэрымэнты над дзяцьмі, геніяльнымі асобамі, ненармальнымі і г. д. Ужываецца між іншым мэтад анкетаў і тэстаў. Асабліва момант экспэрымэнтальнае псыхолёгіі акцэнтавалі нямецкія і францускія псыхолёгі Вэбэр (Weber), Фэхнэр (Fechner), Вунд (Wundt), Бінэ (Binet) ды іншыя.

**Успамагаўчыя дысцыпліны.** Псыхічнае жыцьцё ёсьць вельмі ўзалежнена ад вонкавага сьвету, а дзеля таго, каб зразумець псыхічныя працэсы, неабходна мець дачыненьне з цэлым радам іншых навук, разглядаючых сьвет. Гэтак, з пабочных успамагаўчых прадметаў трэба залічыць: біолёгію (навуку аб жыцьці наагул), фізіолёгію (навуку аб функцыях арганізму), анатомію (навуку аб будове арганізму), псыхіятрыю (навуку аб душэўных хваробах), лінгвістыку (навуку аб мовах, асабліва ўзьнік і разьвіцьцё мовы), соцыёлёгію (навуку аб разьвіцьці й структуры гвамадзянства), гісторыю і г. д. — Усе гэтыя прадметы зьяўляюцца неабходнай крыніцай пры тлумачэньні псыхічных зьявішчаў. Азначаныя прадметы аднак маюць укоснае адношаньне да псыхолёгіі, бо зьяўляюц-

ца самыя па сабе зусім самастойнымі дысцыплінамі.

**Нэрвовая сыстэма**. Арганізм чалавека ўспрыймае ўплыў знадворнага сьвету праз нэрвовую сыстэму, а нэрвы зьяўляюцца спалучнікамі між сьветам вонкавым і ўнутраным. Асяродкам нэрвовай сыстэмы ёсьць галаўны мозг (складаючыйся з 2-х паўкуляў) і мозг сьпінны. (Гл. рыс. № 1). Адсюль адбочвае вялікае мноства больных, ці меншых нэрвовых валокнаў або ніцяў і каморак. Для вытлумачэньня нэрвовага мэханізму ў навуцы істнуюць дзьве тэорыі: нэйронная і фібрылярная. Першая палягае ў тым, што быццам нэрвы складаюцца з анатамічных, вельмі простых ( нераскладальных ) адзінак г. зв. нэйронаў. Кожны з гэтых нэйронаў мае падвойнага роду атожылкі ці галінаваньні, як у дрэве. З аднаго боку — адзін даўгі (восева-цыліндрычны), з другога некалькі кароткіх (протоплязмічных). Першыя галінаваньні складаюцца з другімі мэханічна.



Рыс. 1. Галаўны мозг з часткай сьпіннога мозгу паказаны ў разрэзе з правай стараны. Мазгавая паўкуля пакрытая зьвілінамі. Пад ёй малы мозг, а ніжэй, паміж пазваночнікаў — сьпінны.

Паводле другой тэорыі, фібрылярнай, праўдловыя нэрвовыя шляхі складаюцца не з паасобных нэйронаў і каморак, а з суцэльных нэр-

вовых ніцяў (г. зв. нэўрофібрылі). Апошняя тэорыя новая і мала пашыраная.

Чуласьць да нэрвах перадаецца вельмі хутка, каля 68 мэтраў за сэкунду.*) Нэрвовыя ўзбуджаньні дзелім на дзьве групы. Да першае групы залічаем узбуджаньні чулыя, ідучыя з мейсца фізычнага парушэньня паверхні цела да мазгавога цэнтру (цэнтропэтальныя або сэнсарычныя рухі), да другой групы залічаем пабуджаньні руховыя, ідучыя ад мазга назад да паверхні цела (цэнтрофугальныя або моторычныя рухі). Апрача гэтых дзьвух відаў рухаў ёсьць яшчэ рэфлексыўныя г. ё. адбываючыеся паміма нашай волі (напр. ударыўшы па калене, нага адскаквае), аўтоматычныя (біцьцё сэрца, міганьне павекаў) ды іншыя.

**Лёкалізацыя здольнасьцяў** Псыхолёгі і фізіолёгі імкнуцца знайсьці больш дакладную сувязь паміж праявамі душэўнымі й ўласьцівасьцю мазгавых цэнтраў. Удалося сьцьвердзіць, што кожны акт псыхолёгічны зьвязан з дзейнасьцю тае або іншае часткі ў мазгу. Апошні мае выгляд дзьвух паўкуляў пакрытых зьвілінамі і барознамі. Барозны ўсю поверхню мазгавых паўкуляў дзеляць на пэўныя вучасткі, а кожны з гэткіх вучасткаў выконвае сваю функцыю. Чым больш дасканальная жывая істота, тым болей у мазгу знаходзіцца барознаў ды зьвілінаў і гэтым самым болей выяўляецца лёкалізацыя г. ё. мейсца, ў якім адпраўляецца тая ці іншыя функцыя (ад лацінскага слова locus — мейсца).

Каля вуха гэтак званая вісачная частка — складае слухавую галіну ў мазгу; патылічная частка — творыць узрокавую галіну; цэнтр смаку — зьвязаны з лобачнай зьвілінай, а цэнтр нюху знаходзіцца троху наперад ад цэнтра слуху. (Глядзі

*) Некаторыя вучоныя (Піпэр) падаюць скорасьць нэрвовага току нават 120 мт. у сэк.




Рыс. № 2. Рысунак азабражае схэму г.зв. часьцінаў у галаўным мозгу. Па тэорыі лёкалізацыі, кожная з гэтых часьцінаў кіруе адпаведнымі здольнасьцямі і рухамі нашых ворганаў цела.

рыс № 2) Ёсьць цэлы рад гэткіх цэнтраў. Пры пашкоджаньні нэрвовага цэнтру ў мазгу, чалавек (таксама і жывёла) губляе здольнасьць рэагаваць. Напрыклад, здараецца, што чалавек на вонак мае нармальныя пальцы, але ня здольны пісаць (аграфія), або мае нармальны на вонак язык і горла але ня можа гаварыць (афазыя) і г. д. Часта паўстае пытаньне: ці форма й абыймо чэрапу і вага мозгу ўплывае на душэўныя зьявішчы, ці не? На гэта адказу пэўнага пакульшто вучонымі ня дадзена, хоць большасьць схіляецца да цьверджаньня, што ад гэтага залежыць інтэлігэнцыя чалавека. Ведама, аднак, што вага мазгу чалавека ў сярэднням = 1286 грамаў, а часамі сустракаецца нават звыш 2000 грам.; паверхня = 1588—2400 $cm^2$

**Розныя погляды на ўзаемаадносіны паміж целам і душой** Існуюць розныя погляды й кірункі ў псыхолёгіі адносна ўзаемаадносінаў паміж целам і душою. Д у а л і с т ы я — гэта прадстаўнікі пагляду, што існуе асобна матэрыя і асобна дух. М о н і с т ы вучаць: — цела і дух дзьве старонкі аднэй і тэй самай сапраўднасьці. М а т э р'я л і с т ы цьвердзяць, што ўсе зьявішчы псыхічныя можна вытлумачыць толькі рухамі матэрыі.*) Т э о р ы я і д э н т ы ч н а с ь ц і—што зьявішчы псыхічныя можна зьвесьці да фізычных і наадварот.

**Клясыфікацыя псыхічных зьявішчаў.** Усе псыхічныя зьявішчы неабходна падзяліць на групы, або, інакш кажучы, склясыфікаваць іх. Клясыфікацыя іх можа быць розная, у залежнасьці ад тых ці іншых пунктаў гледжаньня. У залежнасьці, напр, ад будовы, зьявішчы падзяліць можна на

---

*) З гэткага матэр'ялістычнага пункту гледжаньня разглядаецца й дасьледжваецца псыхолёгія ў Радавай Беларусі (ды наогул у Радах). Найяскравейшым прыкладам такой аднабокай літэратуры ёсьць „Падручнік псыхолёгіі“ праф. Карнілава й у беларускай мове, выданай у Менску, 1927 г.

а) элемэнтарныя (простыя) псыхічныя факты і в) складаныя псыхічныя факты. Дзяліць можна і зувагі на адносіны асобы да прадметаў: а) пазнаваньне прадмету і в) жаданьне прадмету, і т. д.*) Дзеляцца псыхічныя зьявішчы яшчэ і наступна: а) пазнаваньне, в) пачуцьці, с) воля. Гэтага, больш-менш, падзелу будзем трымацца, пераходзячы да азнаямленьня з самым прадметам псыхолёгіі.

---

*) В. Вітвіцкі ў „Нарысе псыхолёгіі" разрозьнівае 4 групы псыхічных зьявішчаў: 1) Уражаньні, 2) Суды, 3) Пачуцьці, 4) Выяўленьні волі.

BIBLIOTEKA NAKOŁOWSKA

# ЭЛЕМЭНТАРНЫЯ ПСЫХІЧНЫЯ ЗЬЯВІШЧЫ*).

**Чуцьцё.** Элемэнтарным псыхічным зьявішчам, якое ня можна разлажыць на больш простыя, ёсьць чуцьцё (sensation). Я бачу, я трымаю пяро, я чую і г. д. Тэрмін чуцьцё стварыўся ад дзеяслова чуць (я чую боль, я адчуваю боль). Усё, што мы чуем, адчуваем, успрыймаем, як вынік дзеяльнасьці нашых ворганаў, называем чуцьцямі. Праз чуцьці мы пазнаем вонкавы сьвет. Калі я трымаю пяро, то я адначасна пазнаю яго, я здабываю веду аб даным пяры, я ведаю, якое яно: яго колер, цьвёрдасьць, гладкасьць і г. д. Усё гэта я пазнаю ворганамі зроку і дотыку. Чуцьці гэтыя ўжо ня можна разлажыць.

Чуцьцё паўстае ў нашай сьведамасьці пасьля пэўнага раздражненьня нэрваў нашых ворганаў (зрокавага, слухавога і г. д.). Але гэтыя раздражненьні ў нашым арганізьме не прадстаўляюць яшчэ сабой чуцьця: мы мусім здаць сабе справу, што нас б а л і ц ь, што мы б а ч ы м, інакш, усьведаміць гэты акт.

Пры бліжэйшым разглядзе, мы пазнаем у чуцьці тры мамэнты: ф і з ы ч н ы, (прыходзячы з вонку), ф і з і о л ё г і ч н ы (адбываючыся ў нашым арганізьме) і п с ы х і ч н ы (паўстаючы ў нашай сьведамасьці). Псыхічныя зьявішчы, у чыстым выглядзе, самыя па сабе не сустракаюцца: яны злучаны з рознымі чуцьцёвымі працэсамі. Зна-

---

*) Інакш гэты разьдзел можна назваць: „Псыхолёгія пазнаваньня“.

чыцца, элемэнтам псыхічнага жыцьця чалавека будзе ўсьведамленьне тых пабуджэньняў, якія дзеюць на яго органы. Фізіолёгічна гэта тлумачыцца тым, што падчас псыхічнага працэсу дзеюцца молекулярныя зьмены ў нэрвах з вельмі хуткай скорасьцю.

Каб выклікаць чуцьцё, неабходна адпаведная сіла ўзбуджаньня або інтэнсыўнасьць, бо калі парушэньне нэрву ня дойдзе й не перадасца ў мазгавы цэнтр, дык не атрымаем чуцьця (усьвядомленага рэфлексу), а толькі нясьведамы рух у нэрвах. Чуцьцё адзначаецца яшчэ якасьцю (квалітай) г. ё. асаблівасьцю, дзякуючы якой адрожніваем і ня зьмешваем чуцьцяў (напр. смак ня зьмешваем з слухам, дотыкам або наадварот і г. д.) і таксама чуласьцю, бо чуцьцё выклікае пачуцьцё прыемнасьці або няпрыемнасьці. Кожны наш ворган рэагуе на нешта яму ўласьцівае й толькі. Можна было-б пералічваць шмат уласьцівасьцяў чуцьцяў, як напрыклад: зьмястоўнасьць, неперадавальнасьць, нязьмернасьць, суб'ектыўнасьць ды інш.

Прынята разглядаць у псыхолёгіі пераважна толькі пяць чуцьцяў, як падстаўовыя: з р о к, с л у х, н ю х, с м а к і д о т ы к. Але апрача гэтых, істнуе цэлы рад іншых чуцьцяў цялесных (перадусім мускульных); значэньне гэтых апошніх другараднае. Разгледзім цяпер кожнае з вонкавых чуцьцяў паасобку.

**Зрок**. Чуцьцё, якое дае нам вока ад узбуджаньня адпаведных ворганаў, зьвязаных з ім, называем зрокам. Пры помачы зроку мы найлепей, пазнаем акружаючы нас сьвет. Зрокавая дзейнасьць, галоўным чынам, палегае ў успрыйманьні сьвятла й распазнаваньні колераў. Калі-б мы хацелі шукаць фізычную прычыну зрокавага чуцьця — дык прышлі-б да выніку, што гэта нішто іншае, як хваляваньне этэру. Пры помачы

спэктру (прапушчэньня касуляў сьвятла праз прызму) распазнаем с е м аснаўных колераў у наступным парадку: чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні і фіалёвы. Агулам-жа іх ёсьць вельмі многа. Паміж чырвоным і фіялетавым колярамі у спэктры фактычна каля 150 розных адценяў. (Гл. рыс. № 3).




Рыз. № 3. Зорка коляраў.

Колер залежыць ад даўжыні сьветлавое хвалі і ад яе дрыжаньняў. Найдаўжэйшай сьветлавой хваляй ёсьць чырвоная — 395 біліёнаў дрыжаньняў; найкарацейшая хваля—фіалетавая, мае 760 біліёнаў дрыжаньняў. У азначаным вышэй парадку колераў, ад чырвонага да фіалёвага, хва-

лі становяцца карацейшымі, але лік дрыжаньняў павялічваецца.

Будова нашага вока такая, што ўзрокавы нэрв і сеткавіца рэагуюць на прыходзячыя з вонку хвалі і дрыжаньні сьветлавых касуляў. Пры гэтым зрокавы нэрв мае цэлы рад валокнаў.*) Кожная група валокнаў мае тую ўласьцівасьць, што ўспрыймае толькі пэўны колер. Па тэорыі Гэльмгольца існуе ў воку тры групы валокнаў. Падражненьне кожнае з гэтых групаў выклікае адчуваньне чырвонага, зялёнага або фіалёвага коляру. У залежнасьці ад ступені ўзбуджэньня пэўнае групы валокнаў, атрымоўваем усемагчымыя адцені коляраў спэктру. Аднолькавае ўзбуджаньне трох групаў — дае белы колер. У доказ прыводзіцца наступны досьлед: бярэцца кола і робіцца круцёлка з роўных паперак чырвонага, зялёнага і фіалетавага колеру. Пачаўшы круціць— атрымаем белы колер, бо яны зьліваюцца. (Гл. рыс. №4). Калі-ж пэўная з азначаных групаў у воку пераважае, або мацнейшая за іншую, то атрымоўваецца хвароба нераспазнаваньня двух коляраў, або зьмешваньне. Асабліва распашырана зьмешваньне чырвонага колеру з зялёным (дальтанізм). Характэрна, што дальтанізм больш разьвіты ў мужчын чым у кабет. Закон фізыкі вучыць, што асьветленыя прадметы адбіваюць ад сябе ўсе, або большасьць сьветлавых касуляў і таму яны здаюцца нам белымі, а другія — праглынаюць і здаюцца нам чорнымі (абсорбцыя). Значэньне ўзроку для псыхічнага жыцьця чалавека ёсьць вельмі вялікае, бо праз яго атрымоўваем каля $^{3}/_{4}$ уражаньняў з вонкавага сьвету.*)

---

*) Шырэй аб будове вока гл. ў „Фізыцы“ (літ.) А. Н. Трэпкі і „Анатоміі і фізыёлёгіі чалавека“ — Малышова.

*) Зрэштай, усе нашыя органы чуцьцяў вельмі ўзалежнены між сабой, каб казаць аб пераважаючым значэньні адных або другіх.

**Слух.** Слух-гэта чуцьцё, якім мы распазнаем гукі.

Пад гукамі разумеем правідловае і неправідловае дрыжаньне паветра, якое рэагуе на нашае вуха (тоны, шумы, грымоты акорды, актавы і г.д.). Фізычная прычына чуцьця слухавога — хваляваньне паветра. Чым хваля ёсьць карацейшая, тым тон будзе вышэйшы і наадварот. Наш слухавы апарат, які дзеліцца на вонкавае, сярэдняе і ўнутранае вуха, мае здольнасьць (як кажа Вэ-




Рыс. № 4.

бэр і Гэнзэн) успрыймаць да 6.000 асобных гукаў. На слухавую перапонку дзеюць дрыжэньні і ад правідловага дрыжэньня хвалі, ўзьнікае тон, ад неправідловага — грымоты і трэскі. У музыцы распазнаём глыбіню і вышыню тонаў. Аснаўных тонаў сем: do, re, mi, fa, sol, la, si. Калі чуем аднач асна аднолькавыя гукі ад do (нізкага) да do (вышэйшага) маем актаву. Нармальнае вуха распазнае да 15-ёх актаваў. Некалькі хваляў зьліваючыся ў вадну хвалю выдаюцца прыемнай, ці гарманічнай (консонанс), або няпрыемнай, ці неміла-

гучнай (дысонанс). Высьвятляецца гэта тым: чым болей супольных у хвалях тонаў, тым гукі гарманічнейшыя.*)

І слух мае вялізарнае значэньне для псыхічнага жыцьця. Усе псыхічныя праявы мы можам перадаць пры помачы гукаў. Адначасна пазнаем праз гукі акружаючую нас прыроду, якая бяз гукаў здавалася-б нам мёртвай.

**Нюх.** Ворганам адчуваньня нюху зьяўляецца сьлізістая абалонка ў носе. Падражняць яе могуць прадметы ў газавым стане (г. ё. дробныя часткі ў паветры), якія асядаюць на нюхавы нэрв. Нюхам распазнаем пах або смурод. Чуцьцё гэтае вельмі далікатнае і чалавек карыстаецца ягонымі паслугамі для сваіх інтэлектуальных мэтаў. У прыродных навуках нюх мае асабліваe значэньне.

**Смак**. Чуцьцё смаку зьвязана з языком, які рэагуе на аснаўныя смакавыя асаблівасьці: 1) салодкасьць, 2) горкасьць, 3) кіслату і 4) салёнасьць. Рэшта смакаў — комбінацыі з аснаўных.

**Дотык.** Аснаўныя ўласьцівасьці датыковае чуласьці: цьвёрдасьць, мягкасьць, цяплыня, холад, жорсткасьць і цяжар. Чуцьцё дотыку залежыць ад сілы падражненьня паверхні скуры (знадворная і ўнутраная сьлізьніцы цела). Фізіолёгічна тлумачыцца асобнай пабудовай канцавых нэрваў залягаючых у скуры і рэагуючых на цісьненьне. Цісьненьне перадаецца па нэрвах у мазгавы цэнтр. Чуласьць на целе ня ўсюды аднолькавая, напрыклад кончыкі пальцаў і языка — чулейшыя ад іншых частак певерхні скуры. Як было ўжо зазначана, ёсьць цэлы шэраг іншых чуцьцяў, асабліва му-

---

*) Вельмі добра выясьнены фізычна слухавыя зьявішчы ў „Фізыцы" інж. А. Н. Трэпкі (літ.) II частка.

скульных. Мускулы ў залежнасьці ад падражненьняў (холаду, цяплыні і г. д.) дэформуюцца і выклікаюць адпаведные рухі й чуцьці.

**Закон спэцыфічнае энэргіі**. Вучоным фізіолёгам Мюльлерам устаноўлена, што кожны ворган успрыймае толькі ўласьцівыя яму раздражненьні; гэты закон носіць назоў закону спэцыфічнае энэргіі.

Пры аднолькавым, гарманічным разьвіцьці ўсіх чуцьцяў і ворганаў у індывідууме адзначаем яго нармальным. Калі-ж разьвіваюцца некаторыя асаблівасьці дадатнія, альбо адʼемныя, ў чалавека,— гаворыцца аб здольнасьцях або дэфэктах. Здольнасьці, як напр. да музыкі, малярства, матэматыкі, і г. д., могуць быць уроджаныя (дэдычныя) або прыдбаныя штучна пэўнымі практыкаваньнямі. Удасканаленьне чуцьцяў дзеецца асабліва праз спэцыяльныя фаховыя школы і адпаведнае выхаваньне (асаблівую ўвагу зьвяртаюць на разьвіцьцё у дзяцінных садох).

Вонкавыя (прыродная) варункі таксама з бегам часу ўплываюць на паасобнага чалавека, або і цэлыя пляменьні. Зьмены псыхічнага, а часамі фізыолёгічнага характару часта бываюць відавочныя, як даказывае нам антраполёгія, соцыолёгія ды іншыя ўспамагаўчыя дысцыпліны.

**Псыхофізычны закон Вэбэра-Фэхнэра.** Нямецкія вучоныя, Вэбэр і Фэхнэр акрэсьлілі адносіны між чуцьцём і раздражэньнем. Калі мы павялічым раздражэньне ў два, тры або некалькі разоў, то рэакцыя на гэтае раздражненьне (чуцьцё) ня будзе прапарцыянальна да гэтага павялічэньня. Калі ў пакоі мы чуем ігру аднаго патэфона, то чуцьцё, узьнікшае ад слуханьня двух патэфонаў (адно дадатковае раздражненьне), ня будзе ў два разы сільнейшае, чым ад слуханьня аднаго. Ня можам наагул мерыць чуцьця. Фэхнэр, пры досьледах, заўважыў, што дадатковыя раз-

дражэньні павінны знаходзіцца ў сталых адносінах да дадзенага, каб чуцьцё, атрыманае ад сумы раздражэньняў, адрозьнівалася ад чуцьця папярэдняга (напр: калі мы да 60 грамаў дадамо ня меньш, як 30 грамаў, дык толькі тады пачуем розьніцу ў цяжары). Фізык Фэхнэр акрэсьліў лічбова гэтыя адносіны. Па яго закону для таго, каб нашыя чуцьці прырасталі ў арытмэтычнай прагрэсыі, трэба, каб раздражэньні павялічваліся ў геомэтрычнай прагрэсыі.*)

**Наіўны рэалізм.** Наіўны рэалізм гэта такі сьветапагляд, падставай якога зьяўляецца цьверджаньне, што ўсё істнуючае ў вонкавым сьвеце і успрыйманае нашымі ворганамі, ёсьць запраўды такім, як нам выдаецца. У сутнасьці цьверджаньне гэткае неправідловае, бо на досьледах мы пераконваемся, што ворганы нашых чуцьцяў не дасканальныя й часта нас ашуківаюць. Напрыклад: кій устаўлены ў ваду выдаецца нам зломаным. Або і сьвятло на першы погляд істнуе рэальна, у сутнасьці фізычна мы яго раскладаем на цэлы шэраг колераў, якія прадстаўляюць з сябе дрыжачыя хвалі. Значыцца, цьверджаньні падобныя—наіўныя, памылковыя. Абумоўліваюцца ворганы нашы асобнай констытуцыяй. Каб былі зьменены ворганы нашы, то й сьвет прадстаўляўся-б нам зусім інакш.

**Успрыйманьне і прадстаўленьне.** Паасобныя чуцьці злучаны паміж сабой. Напрыклад, трымаючы яблыка ў руцэ трудна разглядаць ягоныя уласьцівасьці: шурпатасьць, гладкасьць, коляр і г. д.; паасобную якасьць яблыка мы адчуваем, але ўсё разам успрыймаем. Так і з кожным прадметам. Вось-жа злучэньне й усьведамленьне намі некалькіх чуцьцёвых уласьцівасьцяў — завем успрый-

---

*) Адносіны між чуцьцямі і раздражэньнямі зусім такія, як адносіны між лічбамі і іх лёгарытмам. (раздражэньні — лічбы 1, 10, 100 — чуцьці — лёарытмы 1, 2, 3).

маньнем. Але адчуваньне, прыдбанае намі ад паасобных прадметаў праз чуцьцё, ня зьнікае бязсьледна, яно застаецца нават тагды, калі прадмет перастаў дзеяць. Гэта завецца ўжо прадстаўленьнем. (Напр. я бачу дом і праз некалькі дзён аднаўляю яго выгляд у сваёй сьведамасьці, хоць больш і ня бачу). Так паўстаюць вобразы і прадстаўленьні. Здольнасьць-жа аднаўленьня перажытых уражаньняў бяз новага раздражэньня— завем памяцьцю. Адноўленае, рэпрадукаванае ўражаньне ня будзе суцэльнае: будуць у ім пэўныя перарывы, будзе яно на пэўны час зanікаць, як-бы ў імглу, а пасьля йзноў выразна зарысоўвацца. Пры гэтым мы будзем выразна, калярова бачыць рэпрадукаваны прадмет. Сіла прадстаўленьня ня розьніцца ад сілы ўражаньня. Розьняцца гэтыя псыхічныя факты якасьцю. Здольнасьць да атрымліваньня прадстаўленьняў фізіолёгічна тлумачыцца рожна, а перадусім тым, што ўражаньні пакідаюць сьлед у мазгу й якбы фіксуюцца.

Паміж прадстаўленьнямі істнуе сувязь, якая выяўляецца ў тым, што адно прадстаўленьне выклікае другое. Робіцца гэта часта паміма нашае волі, як-бы аўтаматычна.

**Асоцыяцыя прадстаўленьняў.** Прадстаўленьні знаходзяцца ў пэўнай сувязі паміж сабою, злучаюцца пэўнымі групамі й, аднаўляючыся, выклікаюць іншыя. Вось-жа гэтая сувязь прадстаўленьняў называецца ў псыхолёгіі асоцыяцыяй (ад лацінскага слова associare — прылучаць). Устаноўлены чатыры законы асоцыяцыі:

1) асоцыяцыя па падобнасьці, калі прадстаўленьне аб адным прадмеце, падобным да другога, выклікае прадстаўленьне аб апошнім. Напр. калі мы гаворым аб вялікім паэце беларускім Янцы Купале, дык выклікаецца прадстаўлень-

не аб другім падобным па сіле творчасьці — Якубе Коласе і г. д.

2) Ассоцыяцыя па кантрасту — калі адно прадстаўленьне выклікае ў сьведамасьці праціпежнае. Напр. вялікі — малы; цяплыня — холад; багаты — бедны і г. д.

3) Ассоцыяцыя па сумежнасьці — калі ўласьцівасьці прадмету або асобы ўзьнікаюць аднача́сова, бо яны цесна зьвязаны між сабою. Напр. пах бэзу выклікаў у нас прадстаўленьне цьвітучага бэзу.

І ўрэшце 4) ассоцыяцыя ў часей наступнасьці, напр. прадстаўленьне маланкі выклікае адначасна прадстаўленьне грымотаў і г. д.

**Памяць.** Памяць гэта здольнасьць аднаўленьня прыдбаных намі раней прадстаўленьняў бяз вонкавага пабуджэньня, або інакш, памяць — гэта здольнасьць прыпамінань. Памяць у людзей бывае неаднолькавая. Звычайна добрай памяцьцю лічыцца памяць быстрая, правідловая, зьмястоўная й даўгая. Памяць можна ўдасканаліць, у пэўнай меры, адпаведнымі практыкаваньнямі, асабліва частым паўтарэньнем. Адсюль паходзіць і вядомая прыказка: repetitio est mater studiorum (паўтарэньне — матка вучэньня).

Пры разглядзе існуючых відаў памяці можна адзначыць наступныя, як вельмі пашыраныя: зрокавая — калі пры прыпамінаньні карыстаемся ўражаньнямі прыдбанымі ўзрокам (напр. вучань, адказваючы лекцыю, прыпамінае сабе кнігу, старонку й зьмест завучанае лекцыі, як у кнізе); слухавая — калі пераважаюць слухавыя вобразы. Гэтак напр. чалавек, слухаючы, лепей можа паўтарыць і завучыць, чымся чытаючы. Памяць мяшаная ёсьць тады, калі мы ўспрыймаем уражаньні аднолькава ўсімі ворганамі. Ёсьць яшчэ памяць гэтак званая рухальна-мэханічная, разважная (калі шукаецца лёгічная сувязь) ды ін-

шыя віды. Разьвіцьцё тыпаў памяці абумоўліваецца дэдычнасьцю й абставінамі, у якіх узгадоўваецца дзіця. Ёсьць спэцыяльная навука, мнэмоніка, якая падае способы завучваньня.

У сувязі з памяцьцю ёсьць працэс успамінаньня. Успамінаньне ёсьць сумыснае аднаўленьне прадстаўленьняў. Сам акт прыпамінаньня (фізычнага намаганьня) паказвае на недахоп сувязі й залежнасьці паміж прадстаўленьнямі сучаснымі й мінулымі. Апрача таго пры ўспамінаньні дзеюцца зьмены цялеснага выгляду. Калі-ж паміж прадстаўленьнямі нельга навязаць сувязі, дык наступае забыцьцё, як процілежнасьць успаміну. Забыцьцё, гэта ёсьць нyздольнасьць аднаўленьня прадстаўленьняў. Наагул, калі ўражаньні мала паўтараюцца, дык хутка счазаюць (здараецца нават, што жывучы сярод чужых забываецца матчыная мова). Прычыны агульнага забыцьця могуць быць псыхічныя, фізіолёгічныя ды іншыя. Забыцьцё можа быць сталае, часовае і частковае. Да частковага забыцьця можна зарахаваць наступныя віды: а) афазыя — забыцьцё пэўных словаў, b) аграфія — забыцьцё пісаць, c) параграфія — няправідловае пісаньне словаў, d) парафразыя — няправідловае ўжываньне словаў. Часамі гэты хварлівы стан праходзіць і тлумачыцца разрывам сувязі паміж прадстаўленьнямі й рухальнымі чуцьцямі. Затое здараецца так, што ў чалавека праяўляюцца здольнасьці аднаўляць уражаньні з надзвычайнай сілай і яснасьцю. Гэткая празмерная здольнасьць аднаўленьня — завецца гіпэрмэнзыяй (hipermensie). Забыцьцё і прыпамінаньне не залежаць ад нашай волі.

**Увага й выабражэньне.** Увагай называем здольнасьць з цэлага раду ўражаньняў, дзеючых на нашую сьведамасьць, адцемліваць добра й яскрава толькі некаторыя з іх. Напр., калі мы зьвяртаем увагу на кнігу, якая ляжыць на стале, то хоць адначасова бачым стол, алавік ды іншыя

прадметы апрача кнігі, усё-ж яны ня выклікаюць таго ўражаньня, якое выклікае кніга. Або напр., кляса з увагай сачыць за выкладаньнем вучыцеля, хоць на вуліцы раздаецца шум і гутарка. Гэткі від увагі ўнутраны, сьведама выкліканы. Ёсьць яшчэ від мімавольнае, вонкавае ўвагі. Напр.: падчас лекцыі, калі ўся кляса з напружаньнем працуе, раздаецца стук за дзьвярыма і ўся ўвага клясы раптоўна скіроўваецца ў кірунку дзьвярэй. Робіцца гэта мімаволі. Увага часамі зьмешваецца з разуменьнем цікавасьці, але ўвага й цікавасьць (момант прыемнасьці) паняцьці розныя, хоць зьяўляюцца бачынкамі аднаго й таго самага працэсу.

Выбражэньне—гэта форма нашае душэўнае дзейнасьці, калі мы на падставе прыдбаных ўражаньняў творым новыя згрупаваньні й абразы. У залежнасьці ад удзелу нашае волі й сьведамасьці ў тварэньні новых вобразоў можам заўважыць два віды выабражэньня або фантазыі: 1) пасыўны (мэханічны), 2) актыўны (творчы). Пры першым відзе ў выабражэньне не дасягае нашая воля, тут адбываецца бязмэтная гульня прадстаўленьняў (лятуценьне); у другім прыпадку заўважваецца сумысьля выкліканая, творчая праца ў імкненьні да новых прадуктаў. Асабліва гэта заўважваецца ў творчасьці мастакоў, паэтаў, пісьменьнікаў, тэхнікаў, інжынераў й г. д. Але й тут усе комбінацыі творацца на падставе прыдбаных раней прадстаўленьняў. У жыцьці людзкасьці момант выабражэньня-фантазыі гуляе калясальную ролю, бо ёсьць фактарам прогрэсу ў навуцы, культуры і цывілізацыі. У дзяцей фантазыя вельмі вялікая, бо выабражэньне не абмежана пазнаньнямі й жыцьцёвымі досьледамі, як гэта заўважваецца ў дарослых*).

*) У сучаснай псыхолёгіі (а пераважна ў псыхоаналізе) выабражэньню прыпісываецца роль „клапану бясьпечнасьці“, праз які задаваляюцца нашыя непраяўленыя імкненьні, жаданьні й інстынкты. Гэты погляд можна пашыраць і на сфэру творчасьці.

**Аппэрцэпцыя.** Такі псыхічны працэс, калі на падставе раней прыдбаных намі спасьцеражэньняў перапрацоўваем новыя прадстаўленьні, — называем аппэрцэпцыяй Адзін і той самы прадмет у паасобных людзёў выклікае часта рожнае ўражаньне, а гэта таму, што папярэдня набыты пагляд на прадмет гуляе домінуючую ролю. Напр. старадаўная сярэбраная ваза выкліча не аднолькавы пагляд абсэрватараў. Гандляр будзе глядзець з матэр'яльнага пункту гледжаньня, мастак з эстэтычнага, гісторык — гістарычнага й г. д. Ёсьць значыцца пэўная дыспозыцыя (псыхічная ўласьцівасьць) для азначэньня прадмету, прыдбаная сьведама або нясьведама. Аднак часта дзякуючы апэрцэпцыі можна ўпасьці ў ільлюзыю г. ё. бачыць у рэчах тое, чаго ў іх запраўды няма, або інакш, неправідлова іх успрыймаць.

**Час і прастор.** Час не складае нейкую вонкавую адзнаку або якасьць у прадметах, а таксама не адчуваецца ворганамі чуцьцяў, за тое ёсьць адзнакай душэўных зьявішчаў, нашай сьведамасьці. Прадстаўленьне аб часе ўзьнікае так як і іншыя прадстаўленьні, але апрача таго зьвязаны з працэсам успрыйманьня пэўных падзеяў. У нашай сьведамасьці разпазнаем час, як нейкую дыфэрэнцыю паміж зьместам слоў „яшчэ не“ і „ўжо“; нейкі момант няведамага пачатку й няведамага канца. Але разам з гэтым час у нашай сьведамасьці ёсьць паняцьцем суб'ектыўным і адносным. Мерылам часу суб'ектыўнага ёсьць нашае ўласнае „я“, меркай рэлятыўнага (адноснага) — нейкі апарат або аўтомат на кшталт гадзінніка.

Аналягічна да часу й п р а с т о р — прадстаўленьне ня ўроджанае, а прыдбанае намі. У нашых чуцьцях пераважна няма „прасторнасьці“, але без паняцьця прастору мы не маглі-б адцемліваць і ўяўляць палажэньне ня толькі прадметаў раскінутых навокала нас, але й самых сябе. Проекту-

ючы палажэньне прадметаў у прасторы, мы якбы адводзім іх ад нашага „я“ і разьмяркоўваем у гэтым прасторы. Паасобныя атрыбуты спасьцярогі прастору будуць: адлегласьць, паверхня, цягласьць прадметаў (даўжыня, шырыня, глыбіня й вышыня.) Іх мы адчуваем галоўным чынам пры дапамозе ўзроку й дотыку. Гэтак узьнікае разуменьне нейкай пустаты, у якой зьмешчана наша зямная куля; узьнікае прадстаўленьне нейкай безканечнай пустаты, але гэтую пустату ўцяміць ня можам, а дзеля гэтага адсоўваем яе ад нас як найдалей. (Кажам: Бог стварыў сьвет з нічога, але гэтае „нічога“ уявіць сабе ня можам).

Паводле вядомага філёзафа Эмануэля Канта час і прастор гэта толькі форма нашага спасьцеражэньня.

Гэтыя ўвагі аб часе й прасторы сумысьля аднесена да разьдзелу псыхолёгіі пазнаваньня, бо зьяўляюцца неабходным варункам нашага мысьленьня, а таксама тлумачэньня рэчаў і здарэньняў.

## ВІДЫ СКЛАДАНАЕ ДУШЭЎНАЕ ДЗЕЙНАСЬЦІ.

Разгледжаныя вышэй элемэнтарныя псыхічныя зьявішчы (чуцьцё, прадстаўленьне, уражаньне, ды інш.) служаць дзеля распазнаваньня акружаючага нас вонкавага сьвету. Толькі дзякуючы ім у нас паўстаюць больш складаныя псыхічныя працэсы. Складаная псыхічная дзейнасьць (так як і простыя псыхічныя зьявішчы) ёсьць нішто іншае, як усьвядомленая рэакцыя індывідуума (псыхофізычнага!). Чалавек рэагуе на вонкавыя прадметы ў выглядзе паводзінаў. А паводзіны ёсьць вынікам складаных псыхічных працэсаў. У абыймо складанае дзейнасьці душэйнае залічаем наступныя тры віды працэсаў: м ы с ь л е н ь н е, п а ч у ц ь ц ё і в о л ю.

### МЫСЬЛЕНЬНЕ.

Мысьленьне — гэта адзін з працэсаў складанае душэўнае дзейнасьці, выяўляючыйся пры помачы мовы, з мэтай пазнаньня. Сам працэс мысьленьня ёсьць пэўная праца розуму, выконваючаяся ў мазгу, гдзе адбываецца злучэньне (сынтэз) або разлучэньне (аналіз) прадстаўленьняў і ўражаньняў. Мысьленьне зьвязана з мовай г. ё. здольнасьцю чалавека выяўляць пры помачы знакаў (словаў) свае паняцьці й прадстаўленьні другім асобам.

Разьвіцьцё псыхікі выклікала патрэбу, ды ўрэшце прывяло да ўзьніку мовы. Даць тлумачэньне яе ўзьніку доволі цяжка. Ведама толькі адно, што ўзьнікла мова не адразу, а ў выніку

доўгае эвалюцыі. Псыхолёгі й іншыя вучоныя выходзяць з таго пункту гледжаньня, што чалавек на першапачаткавай ступені разьвіцьця насьледаваяў крыкам птушак, жывёлаў, гукам прыроды, удасканальваў гукі, а потым, у залежнасьці ад патрэбаў і перажываньняў, выяўляў іх. Слова павалі сталася зьмястоўным знакам адпаведных станаў нашае сьведамасьці. У гэтых знаках, з адпаведна акрэсьленым значэньнем пэўнага індывідуума, бачым ягонае адношаньне да акружаючага сьвету. Мысьленьне разам з тым — форма пазнаваньня дзеяльнасьці чалавека, якая праяўляецца ў складаньні **паняцьцяў**, **суджэньняў** і **вывадаў**. Мысьліць, інакш кажучы, — прыраўноўваць або разважаць.

З прадстаўленьняў прыдбаных намі, мы, на падставе аналізу або сынтэзу, выказваем пэўнае суадношаньне, творым пэўны посудак або суджэньне. Пры разважаньні мы што небудзь або цьвердзім або адкідаем у адносінах чагосьці да нечага. Заўсёды ў даным прыпадку ідзе гутарка аб дзейніку (суб'екце) і сказьніку (прэдыкаце). Але не абавязкава ў разважаньні мусіць быць момант злучэньня або разлучэньня прадстаўленьняў выабстрагаваных паняцьцяў, (напр. беларуская справа вымагае ахвярнасьці), але можа быць суадношаньне конкрэтных рэчаў і фактаў (напр. жалеза — праваднік цяплыні). Пры посудках (суджэньнях) карыстаемся трыма аснаўнымі мэтадамі: **індукцыяй**, **дэдукцыяй** і **аналёгіяй**.

Індукцыйны мэтад г. ё. такое паступаваньне ў разважаньні, калі з паасобных, адзіночных спасьцярогаў прыходзім да агульнага суцэльнага выснаўку-заключэньня (ад лац. слова inductio — уводзіць). Большасьць прыродазнаўчых законаў збудавана на падстава гэтага мэтаду. Проціўлежнасьць індукцыйнаму мэтаду становіць г. зв. дэдукцыйны, калі ў разважаньні грунтуемся на вы-

вадах ад агульнага да паасобнага (deductio — адводзіць). Урэшце разважаньні па аналёгіі або падобнасьці складаюцца з таго, што ад падабенства двух рэчаў, ці зьявішчаў, у некаторых адзнаках робяць вывад аб падобнасьці гэтых рэчаў і зьявішчаў у іншых адзнаках. Напр. на гэтым палягае і біогенэтычны закон, што дзіця ў сваім разьвіцьці павінна прайсьці ўсе стадыі, якія прайшла ў сваім разьвіцьці людзкасьць.

Ужо няраз зазначалася, што суджэньні нашыя могуць быць памылковыя г. ё. не адпавядаць сапраўднасьці, хоць чалавек імкнецца ўсьцяж пазнаць праўду, бо патрабуе яе для жыцьця. Чым болей чалавек пазнае, тым болей ён узброяны ў жыцьцёвым змаганьні, тым бліжэй да праўды. Што-ж такое праўда? Гэтым пытаньнем займаецца тэорыя пазнаньня — адна з філёзофічных навук. Вось-жа праўда ёсьць згоднасьць нашае думкі (мысьленьня) з тым, што і як ёсьць. Пазнаньне праўды зьяўляецца заданьнем кожнай навукі. Аднак і пазнаньне нашае ёсьць адноснае (рэлятыўнае). Бо пазнаем мы толькі пры помачы нашых чуцьцяў, праз ворганы ня зусім дасканалыя, як мы пераканаліся пры разглядзе аддзелу аб наіўным рэалізьме. Рэшту, тое што чуцьцям чалавека ня прыступна, ён дадумываецца на аснове прыдбаных пазнаньняў. Ужо Джон Лёкк (1637—1704) выказаў думку, што нічога няма ў розуме чалавека, пакуль ня была ў яго чуцьцях. (Nihil est in intellectu, quod non fuerit in sensu). Гэтую самую думку выказываў і Давід Юм, ангельскі філёзаф (1711 — 1776). Праўда — паняцьце да пэўнай меры суб'ектыўнае. На падставе здабытых прадстаўленьняў з акружаючага нас сьвету, мы творым агульныя паняцьці, якія ўзьнікаюць дзякуючы індукцыі або дэдукцыі, аналізу або сынтэзу, абстракцыі й ассыміляцыі. Агульнае паняцьце мы можам акрэсьліць,

як думку аб усіх прадметах пэўнае клясы наагул. Словы рака, сабака, рожа — ёсьць агульныя паняцьці. Калі мы кажам рака, то ня маем на думцы ані Нёману, ані Рэйну, ані іншае ракі, але раку наагул. У агульных паняцьцях разрозьніваем засяг і зьмест. Засягам агульнага паняцьця назавём усе прадметы, якія падпадаюць пад гэтае паняньце. Зьместам агульнага паняцьця — ўсе рысы, адзнакі, якія ўласьцівы ўсім прадметам данага засягу.

Чалавек не супакойваецца пазнаньнем паасобных зьявішчаў і прадметаў у сусьвеце, ён шукае пэўнага адказу на пытаньне: — чаму і дзеля чаго? — а дзеля гэтага, шукае адносінаў між прычынамі й вынікамі й патрабуе досьледу (post hoc, ergo propter hoc); шукаецца сувязь паміж папярэднім і наступным. З гэтага самага пачынае вынікаць патрэба суцэльнага пагляду на жыцьцё і сьвет, які й падае навука філёзофія, якая мае свае навуковыя мэтады досьледаў. Калі-ж сьветапагляд злучаны з культам г. ё. пачытаньнем надпрыродных істот, не абгрунтованы строгімі досьледамі й фактамі, абаснаваны на веры, перакананьні, гэтым самым ён зводзіцца да рэлігіі. У сераднявечныя часы разуменьні: навука, філёзофія і тэолёгія былі амальшто ідэнтычнымі й тольк пазьней настала разграцічэньне назоваў. Навука (веда) скіроўвае думкі да сапраўднасьці, да фактаў об'ектыўна ўсімі прызнаных і на іх апірае вывады, у той час, як вера закладаецца на суб'ектыўных мамэнтах і часта не праверaных фактах.

Прынцыпам навуковага мысьленьня ёсьць у першай меры правідловасьць лёгічная, дастарчальнасьць фактаў і правідловае выслоўліваньне. Памылкі паўстаюць пры неправідловым паступаваньні ў разважаньнях (суджэньнях). Як трэба разважаць, каб не рабіць памылак, вучыць нас

лёгіка—навука аб законах мысьленьня. Могуць памылкі паўставаць адразу-ж ужо пры мамэнце самага ўспрыйманьня ўражаньняў, або пры рэпродукцыі. Сьведама выкліканыя памылкі, з мэтай асьвятленьня нечага не такім, якім яно ёсьць, называем м а н о й. Апрача таго памылкі бываюць прыпадковыя і часта ўзьнікаюць ад дэфэктаў у нашых органах.

**Ільлюзыя і галюцынацыя.** Часта ў выніку неправідловага ўспрыйманьня ўражаньняў у чалавека паўстае такі стан сьведамасьці, які мала адпавядае сапраўднасьці. Гэткае зьявішча псыхічнае называем ільлюзыяй. Напрыклад, некаму здалося, што ў пакоі нешта стаіць каля дзьвярэй, у той час, як у тым мейсцы вісела пальто. У даным выпадку маем прадмет, які ўспрыймаем, але ўспрыняцьце ўражаньня ад гэтага прадмету — здэфармаванае, неправідловае. Добрым прыкладам гэткага неправідловага ўспрыняцьця ўражаньняў можам знайсьці ў творы Гётэ „Лясны Кароль“ (Erlkönig).

Блізкай да ільлюзыі ёсьць г а л ю ц ы н а ц ы я. Апошняе зьявішча чыста хвараблівае, бо без усялякіх вонкавых пабуджэньняў узьнікаюць у чалавека абразы зусім не адпавядаючыя сапраўднасьці. Уласьцівы такі стан людзям нэрвова-хворым або вычэрпаным. Напр.: нехта выразна бачыць, як праз дзьверы ўвайшоў дзед і праз пэўны час зьнік, прычым ніхто з прысутных у пакоі гэтага ня бачыў. Пры галюцынацыях на маем ніякіх вонкавых раздражальнікаў. Прычынай ільлюзыяў і галюцынацыяў ёсьць нарушэньне каркавых цэнтраў у мазгу. Віды галюцынацыяў пераважна бываюць зрокавыя і слухавыя або зрокава-слухавыя. Калі-ж чалавек сьпіць і сьведамасьць вельмі нязначная — тагды адчыняецца шырокае поле для галюцынацыяў.

## ПСЫХОЛЁГІЯ ПАЧУЦЬЦЯЎ.

Пры помачы чуцьцяў мы пазнаем акружаючы нас сьвет і ўласьцівасьці прадметаў. Адныя з прадметаў, або зьявішчаў, выклікаюць у нашай душы задаваленьне, прыемнасьць, іншыя наадварот — незадаваленьне і няпрыемнасьць. Вось такі псыхічны складаны стан, які выяўляецца ў выглядзе прыемнасьці або няпрыемнасьці — называем пачуцьцём. Напр. пэўны колер, гук, пах, музыка, абраз заўсёды выклікае ў нас момант прыемнасьці або няпрыемнасьці, пры гэтым ужываем азначэньні: радасьць, прыгожасьць, сум, захопленьне й г. д. Значыцца, пачуцьцё моцна зьвязана з чуцьцямі, як пазнавальнымі элемэнтамі. Хоць на першы пагляд гэтыя два разуменьні і зьмешваюцца, аднак між імі істнуе істотная рожніца. Чуцьцё — простае зьявішча псыхічнае, пачуцьцё — складанае.

У чым палягае прыемнасьць і няпрыемнасьць?

Дакладна вытлумачыць сутнасьць гэтых станаў цяжка, гэта можна толькі адчуць. Досьледы аднак паказалі, што прыемнасьць зьвязана з павышэньнем жыцьцёвых функцыяў, няпрыемнасьць з паніжэньнем. Узбуджаньні ў нас выяўляюцца або прысьпяшеньнем абегу крыві, біцьцём сэрца, умысловай або мускульнай актыўнасьцю, або наадварот — прыгнечанасьцю, зморанасьцю, заміраньнем і г. д. Усе гэтыя праявы адбіваюцца на выглядзе чалавека й яго захаваньні (паводзінах). Псыхолёгі дадаюць да гэтага яшчэ такое тлумачэньне, што мамэнты прыемнасьці ў большасьці зьвязаны з працэсамі карыснымі для арганізму, а няпрыемнасьці—шкадлівымі. Вось чаму, як жыцьцёвы закон, падсьведама вынікае для ўсіх арганізмаў імкненьне здабыць як найбольш прыемнасьці Ёсьць нават тэорыя прыдбаньня й растраты энэргіі. Чалавек, які ня

зморанаы, з накопленай энэргіяй, імкнецца да нейкай дзейнасьці й, наадварот, зморанаы чалавек імкнецца праз спачынак і падмацаваньне арганізму прыдбаць энэргію. Цікава, што ўжо ў старадаўнія часы грэцкі вучоны філёзаф Арыстотэль (384—322 да Н. Хр.) заўважыў гэта і выказаў думку, што ўмеркаванае ўзбуджэньне таго або іншага воргану зьвязана з прыемнасьцю, а неўмеркаванае з няпрыемнасьцю, болем і мукай. Зморанасьць у сутнасьці ёсьць пэўнае затручэньне арганізму. Асабліва цікавы экспэрымэнт для доказу гэткага цьверджаньня быў зроблены з сабакам. Сабаку ўсадзілі ў круцячаеся кола так, што ён быў змушаны ўвесь час перабіраць нагамі, як-бы бегчы ў коле. Калі-ж узялі потым кроў зморанага сабакі і прышчапілі да іншага, ня зморанага, дык і апошні выявіў зморанасьць.

Пачуцьцё ў прасьцейшых сваіх формах аднолькава адчуваецца малым і дарослым, дзікуном і культурным чалавекам; але пачуцьцё носіць суб'ектыўны характар і часамі рожніцу цяжка вытлумачыць. Хоцьбы ўзяць напр. радасьць скупцабагача і радасьць беднага рабочага ды інш. Пачуцьці нашыя разам з гэтым зьяўляюцца паказчыкамі душэўнага жыцьця, яны паглыбляюць нас самых у сябе г. ё. высоўваюць момант суб'ектыўнасьці, бо розныя ўражаньні ў розных асоб выклікаюць зусім розныя пачуцьці.

Сіла прыемнасьці й няпрыемнасьці не заўсёды аднолькавая. Найвялікшая ступень няпрыемнасьці будзе ўжо называцца балючасьцю, а для найвялікшае ступені прыемнасьці нават асобнага няма азначэньня. Кажуць: асалода, упаеньне, раскоша й г. д., але гэта азначэньні недакладныя. Індэфэрэнтнасьць — ня ёсьць адзнакай пачуцьця. Пачуцьцёвы стан трывае так доўга, пакуль не надыдзе нейкая зьмена ў арганізьме або мысьленьні. Ведамым ёсьць тое, што прыемнасьць, дзе-

ючая даўжэйшы час аслабляецца й пераходзіць у няпрыемнасьць, так як і балючасьць праз даўжэйшы час трываньня — прытупляецца. Розум і сіла волі найлепшы рэгулятар пачуцьцёвага стану.

**Клясыфікацыя пачуцьцяў.** Пачуцьці ўзьнікаюць ад усемагчымых прадстаўленьняў і абставінаў, а таму могуць быць рожныя формы й праявы іх. Клясыфікаваць пачуцьці вельмі трудна, бо іх ёсьць вялікая колькасьць. Падзяліць усё-ж іх можна, перадусім, на дзьве групы; прыемныя й няпрыемныя, а таксама паводле сілы напружэньня. У апошнім прыпадку разьлічаем г. зв. духовы настрой і афэкты. Цэлы рад прадстаўленьняў, адбіваючыхся непаметна на пачуцьцях, у агульнай суме твораць духовы настрой („гумар“) вясёлы або сумны, гнеўны, дабрадушны ды інш.

**Аффэкты**. Кожнае пачуцьцё мае сваё асобае выяўленьне і сілу (інтэнсыўнасьць). Калі-ж пачуцьцё такой вялікай інтэнсыўнасьці, што робіць немагчымай нармальную псыхічную й цялесную дзеяльнасьць, тады маем дачыненьне з аффэктамі. Аффэкт — праява ў вышэйшай ступені пачуцьцяў (шал, роспач, ярасьць і г. д.). Аффэкт паўстае раптоўна або разьвіваецца паступова, па меры таго, як чалавек паглыбляецца ў прадстаўленьне, выклікаючае пачуцьцё. Тут злучаецца рад працэсаў псыхічнага й фізіолёгічнага характару. Кант дзеліць аффэкты на стэнічныя або узбуджваючыя (напр. радасьць, гнеў, ярасьць, увадушаўленьне ды інш.) і астэнічныя або прыгнечваючыя (страх, сумлеваньне, перапалох ды т. падобныя). Аффэкты выклікаюць зьмену ў фізычным арганізьме; дзеюць ад'емна ў арганізьме, асабліва ў нэрвовай сыстэме і праяўляюцца ў гістэрычным плачы, сьмеху, дрыжэньні цела й г. д. Кароткатрывалыя аффэкты мацнейшыя ад доўга-

трывалых, але як адныя, гэтак і другія аслабляюць арганізм чалавека.

**Віды іншых пачуцьцяў.** Пачуцьці, як было зазначана, выклікаюць пэўныя зьмены ў арганізме, як у нутры гэтак і звонку (біцьцё сэрца, прысьпешаны абег крыві, рухі, плач, сьмех, чырваненьне, пот і г. г.), але разам з гэтым знаходзяцца ў пэўным узаемаадношаньні між сабою. Іх можна падзяліць яшчэ і па іншаму прынцыпу: ніжэйшыя (прасьцейшыя) пачуцьці й вышэйшыя (складаныя). Прасьцейшыя пачуцьці: голаду, змору, холаду ды інш., зьвязаны з фізыолёгічнымі працэсамі, аднолькава адпавядаюць як інтэлігентнаму, культурнаму чалавеку, гэтак і дзікуну, стоячаму на першабытным ступені разьвіцьця. Затое пачуцьцёва вышэйшы момант: мараль, эстэтыка й г. д. — у адных і другіх неаднолькавая. Кажам аб эстэтычных перажываньнях або пачуцьцях. Бязумоўна, эстэтычныя перажываньні ўласьцівы ўсім людзям, розьняцца яны толькі характарам. Дзікун, які укладае каменчыкі, мае таксама эстэтычнае перажываньне, як і асоба, слухаючая музыку Бэтховэна. Эстэтычныя пачуцьці называюцца яшчэ безінтэрэсоўнымі. Безінтэрэсоўны яны ў тым сэньсе, што мы не зьмяняем прадмету, з якога чэрпаем перажываньне.

Разгледзім яшчэ некаторыя з прасьцейшых складаных пачуцьцяў.

**Пачуцьцё страху і гневу** Страх,—гэта такі індывідуальны псыхічны стан, які наступае падчас небясьпекі. Сіла страху залежыць ад прадстаўленьняў пагражаючай небясьпекі й ўражлівасьці, а таксама ад нэрвовай сыстэмы. Фізычна пачуцьцё страху выяўляецца паніжэньнем жыцьцёвых функцыяў (біцьцё сэрца, дрыжаньне, сьціснутае дыханьне).

Гнеў—таксама індывідуальны псыхічны стан, калі індывідуум хоча рэагаваць ад'емна на прычыняную яму нейкую крыўду або шкоду і заўсёды

скіроўваецца супроць іншае асобы. Пры страху пазыцыя нашая абаронная, у гневе наадварот — агрэсыўная і зьвязана з пэўным задаваленьнем.




Рыс. № 5. I.—Мімічнае азабражэньне выразу твару чалавека падчас спакойнага, ураўнаважанага стану. II. — Выраз бадзёрасьці і сьмеласьці („добры гумар“). III. — Незадаваленьне (гнеў, злосьць, страх). У першым прыпадку рысы твару прыймаюць гарызантальнае распалажэньне; у другім — прыпаднятае й ў трэцім — апушчанае.

Калі-б мы фізычна не праяўлялі гневу, то праўдападобна, вельмі-б страдалі. (Гл. рыс. № 5).

**Пачуцьці сораму, нуды й самазадаваленьня.** Сорам — гэта пачуцьцё, якое ўзьнікае, калі істнуе пэўная дагадка, што думаюць аб нас іншыя ад'емна, асабліва пасьля якога небудзь учынку,

заслугоўваючага на асуджэньне. У чалавека ёсьць уроджанае імкненьне паказаць сябе, а таму ўсьведамленьне ў нас самых нечага дадатняга, выклікае самазадаваленьне й наадварот. (Напр. уменьне іграць, сьпяваць, маляваць). Аднастайнасьць прадстаўленьняў выклікае пэўную апатыю й бяздзейнасьць, выяўляючуюся ў пачуцьці нуды.

Вышэй пералічаныя пачуцьці, страху, гневу, сораму ды іншыя, гэта віды пачуцьцяў эгаістычных (хоць часамі уласьцівы цэлай масе, натоўпу), бо ў іх аснове ляжыць інстынкт самазахаваньня. Вось-жа тыя пачуцьці, якія зьвязаны з захаваньнем асабістага жыцьця называюцца індывідуальнымі, эгоістычнымі або аўтопатычнымі, а тыя, якія зьвязаны з захаваньнем іншых індывідуумаў — соцыяльнымі пачуцьцямі альтруістычнымі або гэтэропатычнымі. Апошнія вынікаюць з пачуцьцяў эгаістычных і ўзьнікаюць ад спачуваньня аднае асобы другой. Адсюль паходзяць паняцьці: сяброўства, пашаны, удзячнасьці і каханьня (пачуцьці сымпатычныя). Каханьне — у найшырэйшым разуменьні ёсьць туга, якая зьяўляецца прадметам патрэбы іншае асобы. Каханы прадмет, або асоба, станов'цца вельмі блізкай й як-бы ўласнасьцю другое асобы. Вось чаму кожнае імкненьне заўладаць ёю выклікае зайздрасьць, гнеў і нават помсту. Каханьне матчынае або бацькоўскае найлепшы ўзор сымпатычнага пачуцьця. Гэтыя пачуцьці мы заўважваем ня толькі ў людзей, але й жывёлаў. Пачуцьці соцыяльныя вельмі важны від сымпатычных пачуцьцяў, палягаюць яны ў тым, што пашыраюцца не на адну асобу, а на грамадзянства. Формы і віды грамадзкага пачуцьця розныя. У першую чаргу гаворыцца аб „любові да блізкага“ ў шырэйшым разуменьні гэтага слова (гуманнасьць) і любові да бацькаўшчыны (патрыятызм). На гэтых-жа падставах будуецца палітыч-

ны лад апошніх часоў асабліва з лёзунгамі свабоды, роўнасьці і брацтва. Гэта ёсьць апошнім дасягненьнем людзства, хоць многія з гэтых прынятых ідэяў былі вядомымі на прадвесьні гісторыі, а любоў да бліжняга сталася нават заветам хрысьціянства.

**Ідэёвыя пачуцьці** ўзьнікаюць ад прыраўніваньня іх да нечага такога, чаго ў сапраўднасьці няма, але што павінна была-б быць.

Гэтак гаворым аб ідэале. Кажам, напр. аб ідэале справядлівасьці, дабра, прыгожасьці і праўды, якія сталіся ўсялюдзкімі.

Зводзяцца гэтыя паняцьці да засад добрых і злых, а апошнія, дастаўляюць нам маральнае пераконаньне і ўплываюьь на раўнавагу нашага жыцьця. Сумленьне ў даным выпадку будзе найлепшым крытэрыям; бо сапраўды ўнутранае пераконаньне ёсьць асновай душэўнага супакою і раўнавагі. Не малую ролю адыгрывае ў псыхічным жыцьці і пачуцьцё рэлігійнасьці, у аснову якога кладзецца пашана Бога — істоты надпрыроднае. Пачуцьцё рэлігійнасьці праяўлялася на працягу ўсяе гісторыі людзкасьці, ува ўсіх народаў і ў розных відах (монотэізм і політэізм). Таемнасьць зьявішчаў прыроды, пытаньні першапрычыны сусьвету, загадка сьмерці — у вялікай меры разьвівае рэлігійнае пачуцьцё.

## ВОЛЯ.

Побач з псыхолёгіяй пазнаваньня (чуцьцяў) мысьленьня і пачуцьця, адным з відаў складаных псыхічных зьявішчаў зьяўляецца воля. На першы пагляд, здавалася-б, воляй можна назваць імкненьні, жаданьні, пастановы і г. д. Гэтае акрэсьленьне аднак ня будзе дакладнае. Мы паяўляемся на сьвет з уроджанымі нам рухамі, якія называем адруховымі або рэфлексыўнымі і інстынктоўнымі. Калі мы выканаем першы раз ней-

кі рух, у нас застаецца прадстаўленьне гэтага руху. У выпадку, калі гэты рух спатрэбіцца, мы зможам яго выканаць, бо ведаем, як ён выглядае. Выкліканьне гэтых усьведамленых рухаў можна назваць воляй. Мы нешта жадаем, пастанаўляем і рэалізуем, выклікаючы да жыцьця той ці іншы рух. Уся культура і цывілізацыя можна сказаць, гэта вынік гэтых рухаў, волі. Від волі, які знаходзіць выражэньне ў рухах назавем пазытыўнай воляй. Пры пазытыўнай волі маем мамэнт вызваляньня рухаў. Апрача волі пазытыўнае істнуе воля нэгатыўная, якая палягае на паўстрыманьні нашых рухаў. Часта адны рухі паўстрымліваем другімі. (Напр. робім рух галавы, каб адагнаць нейкую думку). Такім чынам, волю можам уясьніць як нейкі цэнтр сьведамасьці, праз які праходзяць усе рухі, скуль яны або скіроўваюцца ў кірунку вызваленьня або паўстрыманьня. Інакш волю можам акрэсьліць, як дыспазыцыю (уласьцівасьць) да жаданьняў і пастановаў. Часта кажам аб сільнай волі і слабой. Сільнай воляй называем дыспазыцыю да выкананьня пастановы, ня гледзячы на перашкоды (але ў рамках здаровага розуму).

Слабой воляй адзначаецца той, хто ня можа станоўча пастанаўляць, а калі нават і пастановіць, то ня выканае гэтае пастанаўленьне.

Калі чалавек праяўляе дыспазыцыю да выкананьня пастанаўленьня ня згодна з здаровым розумам, — то такую волю назавём упорствам. Упорныя людзі заўсёды мала інтэлігентныя, агранічаныя.

Клясыфікацыю волі можна праводзіць і далей.

Валявыя працэсы, як было зазначана, мы выяўляем у адпаведных рухах. Рухі-ж жывое істоты дзелім на 1) рэфлексыўныя, 2) аўтоматычныя, 3) інстынктоўныя і 4) давольныя.

Першыя тры віды рухаў гэта такія, якія ад-

бываюцца бяз нашага ўсьведамленьня, бяз удзелу нашае в о л і, узьнікаюць я н ы дзякуючы накапленьню энэргіі ў нэрвовых цэнтрах, або папросту прыроджаны жывой істоце і агулам забясьпечваюць магчымасьць існаваньня. Адбываюцца яны нясьведама, але мэтазгодна. Разьлічаем інстынкты: жыўленьня, самазахаваньня, сацыяльны, размнажэньня і інш. Затое чацьверты від рухаў — рухі давольныя — маюць зусім іншы характар. Яны маюць пэўную мэту і падлягаюць нашай кантролі (цэлёвыя рухі). Напр. перакладаньне рэчаў з мейсца на мейсца. Кожнае імкненьне, жаданьне, ці патрэба чалавека выяўляецца ў дзейнасьці — у давольных рухах. Часамі на дарозе да заспакаеньня гэтых патрэбаў сустракаюцца перашкоды, узьнікае напружаньне волі. Валявы акт вельмі складаны працэс. У ім мы ў сутнасьці імкнемся да здабыцьця прыемнасьці або, унікненьня няпрыемнасьці. У дарозе паступаваньня трэба здабыць прадстаўленьне аб рэчах, умець рабіць выбар прадметаў, мець жаданьне, меркаваньне, пастанову і выкананьне.

Часта паўстае спрэчнае пытаньне адносна свабоды нашае волі. Свабодны чалавек у сваіх паступках? Ці залежаць ягоныя паводзіны і воля ад вонкавага, акружаючага сьвету? Вось-жа тыя філёзофы і псыхолёгі, каторыя цьвердзяць, што воля наша, а значыцца і паводзіны, зьяўляюцца абумоўленыя социяльнымі або біолёгічнымі фактарамі—называюцца д э т э р м і н і с т ы м і. Тыя-ж, якія вучаць, што воля сама зьяўляецца прычынай рухаў і чалавек свабодны ў сваіх паступаваньнях — і н д э т э р м і н і с т ы м і.

Трэба аднак пры гэтым памятаваць, што ёсьць пэўная ўзаемадзейнасьць волі, пачуцьця і розуму.

Калі рухі часта паўтараюцца і не патрабуюць вялікага напружаньня, каб іх выклікаць, і на-

ват бываюць бяз удзелу волі, — называем гэткае зьявішча звыкам. Калі, напр., часта барабаніць пальцамі па сталe, то праз пэўны час мы будзем выконваць рухі пальцаў аўтаматычна. Калі гаворым аб сіле волі, дык разумеем згоднасьць дзеяньня з перакананьнямі чалавека. Слова „пэўнасьць сябе“ або „сіла волі“ часта заменьваецца тэрмінам „характар“, які знаходзіцца ў сувязі з воляй.

**Характар і тэмпэрамэнт** — гэта ёсьць сума ўсіх псыхічных уласьцівасьцяў, каторымі адрожніваецца адзін чалавек ад другога.

Англьскі вучоны Бэн дзеліць характары на тры тыпы: 1) інтэлектуальны, гдзе пераважае праца розуму 2) эмацыянальны, з пераважаньнем пачуцьцяў і 3) актыўны — гдзе пераважае воля.

Ведама, цяжка падвесьці характар кожнага чалавека пад адзін з гэтых тыпаў. Калі чалавек сільнае волі у сваіх учынках трымаецца сталых прынцыпаў, кажам, што такі чалавек мае сільны характэр. Калі чалавек часта адступаець ад гэтых прынцыпаў, дык у такім выпадку кажам аб слабым характары. Калі ў учынках і захаваньні чалавека няма ніякіх прынцыпаў, тады кажам аб безхарактэрнасьці. Характар шмат залежыць ад тэмпэрамэнту. Словам тэмпэрамэнт азначаюць фізычныя варункі ў арганізьме чалавека, дзякуючы каторым з большай або меншай хуткасьцю і глыбінёй успрыймаюцца перажываныя намі ўражаньні.

Ужо Гіппакрат (грэцкі вучоны з IV в. да Н. Хр.) разьлічаў розьніцу тэмпэрамэнтаў і тлумачыў, што ў арганізьме чалавека ёсьць чатыры віды сокаў, якія ўплываюць на тэмпэрамэнт. Адсюль і паходзяць назовы тэмпэрамэнтаў: 1) сангвінічны, 2) халерычны, 3) мэлянхалічны, і 4) флегматычны. Сангвінік адзначаец-

ца рухлівасьцю, рупкасьцю і адзыўчытасьцю, але і хутка забываючымся на ўражаньні. Флегматык— становіць праціўлежнасьць сангвініку, больш спакойны, разважны, зраўнаважаны. Халерык — чалавек энэргіі і запалу. Мэлянхолік — зачынены ў сабе, усім прыступны, але пасыўны. У чыстым выглядзе, ведама, гэтыя тыпы сустракаюцца рэдка. Пераважна характары і тэмпэрамэнты мяшаныя, хоць усё-ж у кожным індывідууме пераважаюць пэўныя адзнакі таго ці іншага тэмпэрамэнту або характару. Наш характар залежыць яшчэ шмат ад уроджаных (дэдычных) асаблівасьцяў і акружаючага нас асяродзішча. Ангелец Джон Лёкк нават высунуў пагляд, што душа наша ад дзяцінства гэта tabula rasa (чыстая дошка) на якой запісываюцца ўжо пасьля ўсе прадстаўленьні і ўражаньні акружаючага нас сьвету.

**Сьвядомасьць**. Псыхічнае й фізычнае жыцьцё адзінкі творыць суцэльнасьць, якая выяўляецца паняцьцем „я“. Але трэба адрожніваць „я“ фізычнае ад „я“ духовага. Спачатку дзіця мае прадстаўленьне аб фізычным (цялесным) „я“, і толькі з бегам часу, калі становіцца дарослым, далучаецца прадстаўленьне і аб духовым „я“. Пад выражэньнем „я“ разумеецца нешта акрэсьленае, пэўнае; выяўляецца індывідуальнасьць. А ўсё тое, што індывідуум сам аб сабе ведае, тыя прадстаўленьні, якія ён набывае і памятуе, і якія разам з гэтым ёсьць адзнакай яго ўнутранага жыцьця,— даюць нам паняцьце „суб‘екта“. Праціўлежнасьцю „суб‘екта“ зьяўляецца „об‘ект“.

З разуменьнем „я“ зьвязана яшчэ паняцьце сьведамасьці й сябесьведамасьці. Усё тое, што мы перажываем, як нешта псыхічнае, ёсьць прадметам нашае сьведамасьці. Але сьведамасьць у чалавека часта бывае зацемнена часова, або пэрыядычна (летаргія, абамленьне, сон) і ў канцы перарываецца зусім, калі наступае сьмерць.

Нармальчай, пэрыядычнай зьменай дзейнасьці ў арганізьме, ёсяць працэс спаньня, з характэрнымі яму снабачаньнямі (соннымі марамі).

**Сон** — гэта такі пэрыядычны стан чалавека, які фізіолёгічна выяўляецца няздольнасьцю да выконваньня валявых рухаў і задаваленьня жыцьцёвых патрэбаў, а псыхічна выяўляецца станам няпрытомнасьці. Падчас спаньня бачым г. зв. снабачаньні, якія вельмі фантастычныя і ня маюць ані прыродных, ані лёгічных межаў. Аднак у сутнасьці няма ў снабачаньнях нічога нованага, чаго-б мы не перажывалі або ня бачылі падчас сьвядомага стану; залежаць яны часта ад вонкавых уражаньняў. Пры гэтым снабачаньні падобны да ільлюзыяў і галюцынацыяў, аб якіх гутарка была ўжо раней. Фізыолёгічнай прычынай спаньня ёсьць зморанасьць арганізму, а прычыны снабачаньняў устанавіць цяжка. Ведама, што на снабачаньні ўплываюць вельмі ўсялякія зьмены ў арганізьме (неправідловы абег крыві, дыханьне, жалудак і г. д.).

У сучаснай псыхолёгіі, асабліва ў псыхааналізе, запачаткаванай д-рам З. Фройдам, сонным марам і мараньню на яве прыпісываецца вялікае значэньне. Разрозьніваюцца ў ёй: 1) сфэра сьведамай псыхікі і 2) сфэра нясьведамай псыхікі. Восьжа ў снах праяўляецца нясьведамая псыхіка, а перадусім нашыя незаспакоеныя інстынкты, жаданьні і імкненьні. Напр. дзіцяці, якое ня мае калегаў, сьніцца, што яно апавядае казку, а шмат дзяцей уважна яго слухае. Сны часта бываюць вельмі скамплікаваныя, але й тады можна дашукацца вышэйуспомненых прычын.

## НЕНАРМАЛЬНЫЯ ПСЫХІЧНЫЯ ЗЬЯВІШЧЫ.

Наагул вельмі цяжка правесьці мяжу між нармальным псыхічным тыпам і ненармальным. Зазвычай, тое, шмат ўласьціва большасьці людзей,

называем нармальным; што ўласьціва некаторым — ненармальным. Да ненармальных зьявішчаў псыхічнага жыцьця залічаем звычайна псыхічныя хваробы, як: в а р'я ц т в а, якое характэрызуецца зрывам лёгікі, або хвараблівы стан праз н е а д ч э п н ы я і д э і г. зв. idèes fixes; м а н і я п р а с ь л е д а в а н ь н я ды інш.

Наагул анармальныя душэўныя зьявішчы — зьяўляюцца вынікам пэўнага дэфэкту ў арганізьме.

Галоўнай адзнакай нормальнага псыхічнага жыцьця ёсьць перадусім здаровы арганізм. Нічога дзіўнага, што ўжо ў старадаўнасьці быў кінуты кліч, які захаваўся да нашых часоў: „у здаровым целе — здаровы дух!" Гэты кліч асабліва актуальным стаўся ў нашыя паваенныя часы.

## СЛОЎНІЧАК ПСЫХОЛЁГІЧНЫХ ТЕРМІНАЎ.

### (БЕЛАРУСКА—РАСЕЙСКА—ПОЛЬСКІ).

**А**балонка—оболочка—błona, powłoka.
Адсяродкавы—центробежный—odśrodkowy.
Адмена—вариация—warjacja, odmiana.
Аднаўленьне — воспроизведение — odnowienie. odtworzenie.
Адносны—относительный—stosunkowy.
Адумысловы—умозрительный—umysłowy.
Адчувальны—чувствующий—czujący.
Атожылак—отросток—odrostek.
**Б**еспасярэдні—непосредственный—bezpośredni.
**В**алакно—волокно—włókno.
Выабражэньне—воображение—wyobraźnia.
**Г**алінгваньне—разветвление—rozgałęzienie.
**Д**осьлед—опыт—doświadczenie.
Давольныя рухі—произвольныя движения—ruchy dowolne
Дотык—осязание—dotyk.
Дэтэрмінізм—детерминизм—determinacje.
**Ж**ах—ужас—strach.
Жыўнасьць, страва—пища—pokarm.
**З**алоза—железа—gruczoł
Зварот крыві—кровообращение—obieg krwi.
Здань—призрак—widmo.
**І**мкненьне—стремление—dążenie.
**К**амора—клетка—komórka.
**Л**ёгкія—легкия—płuca.
**В**орган — орган — organ.
» узроку—зрения—wzrok.
» дотыку—осязания—dotyk.
» нюху—обоняния—powonenie.
» слуху—слуха—słuch.
» смаку—вкуса—smak.
**П**аводзіны—поведение—sprawowanie.
Падсьвядомы—подсознательный—podświadomy.
Пазнаваньне—познавание—poznanie.
Пах—запах—powonienie.
Пачуцьцё—чувство—uczucie.

Паўкулі мазгоў — мозговыя полушария — półkule mózgowe.
Плоцьныя ворганы — половые органы — organy płciowe
Пляма—пятно—plama.
Прадстаўлвньне—представление—wyobrażenie.
Прастор—пространство—przestrzeń.
Падражненьне—раздражение—podrażnienie.

Разумовы - умственный —umysłowy.
Розум—ум—rozum.
Рухальны нэрв — двигательный нерв — nerw ruchowy.

Сангвінічны — сангвинический — sangwiniczny.
Самаспасьцярога—самонаблюдение —samopostrzeganie.
Сябезахаваньне — самосохранение — samozachowanie.
Сківіцы твару - скулы лица—kość policzkowa.
Сківаца—челюсть—szczęka.
Смак—вкус—smak.
Справаздача—отчет - sprawozdanie.
Страва—пища—pokarm.
Стыкацца соприкасаться—stykać się.
Супярэчнасьць—противоречие - sprzeczność.
Сьвядомасьць—сознание—świadomość.
Сэкрэцыя—выделение, секреция—wydzielenie.

Талент—талант—ta ent.
Твар—лицо—twarz.
Траўленьне—пищеварение—trawienie.
Тулава—туловище—tułów.

Увага—внимание—uwaga.
Уражаньне—впечатление—wrażenie.
Успрыйманьне—восприятие—odczuwanie.

Флегматычны—флегматический—flegmatyczny.

Характар—характер—charakter.

Цела—тело—ciało

Чуласьць—чувствительность—wrażliwość.
Чуцьцё — ощущение — czucie.

Шурпаты—шереховатый—szurpaty.

Экспэрымэнт—опыт—eksperyment, doświadczenie.

Яскравы—ясный—jasny.

BIBLIOTEKA NARODOWA

## ЗЬМЕСТ


Прадмова . . . . . . . . . . . . . . стр. 3
Уступ . . . . . . . . . . . . . . . . стр. 5
Элемэнтарныя псыхічныя зьявішчы . . . стр. 14
Віды складанае душэўнае дзейнасьці . . стр. 28
Мысьленьне. . . . . . . . . . . . . . стр. 28
Псыхолёгія пачуцьцяў . . . . . . . . стр. 33
Воля . . . . . . . . . . . . . . . . стр. 39
Ненармальныя псыхічныя зьявішчы. . . стр. 44
Тэрміналёгічны слоўнічак . . . . . . стр. 46


10703/31

# Кніга таго-ж аўтара
# „BĚLORUS
# a
# BĚLERUSOVE“
## („Беларусь і Беларусы“)

з картай этнаграфічнай
Беларусі і палітычнага
падзелу.

У тэксьце 13 абразкоў.

Старонак 126.

Фармат 8×10.

Кніга напісана пачэску.

Выданьне „Česky čtenar“ Praha 1930.

Цана 12 карон чэскіх. У Польшчы каштуе
3 зл. 50 гр.

Галоўны склад:
„Česky čtenar“, Praha II, Lutzovova ul. č. 3.
Tchécoslovaquie.

Выпісваць можна беспасрэдна са складу,
або праз віленскія беларускія кнігарні.

10703

LIST 1931